Вольга АНЦЫПІРОВІЧ,
*дэкан факультэта дашкольнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ ПАДРЫХТОЎКІ ПЕДАГАГІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

У шматвектарнай падрыхтоўцы педагагічных работнікаў дашкольнай адукацыі на сённяшні момант заканамерна адлюстраваны аспект, які можна вызначыць як лінгвакультуралагічны. Сутнасць яго — у вывучэнні мовы праз прызму нацыянальнай культуры і засваенне культурных каштоўнасцей праз стварэнне адпаведнага моўнага асяроддзя. У існуючай сітуацыі дзяржаўнага руска-беларускага асіметрычнага двухмоўя ў рабоце ўстановы вышэйшай адукацыі маецца неабходнасць улічваць і рускамоўнае асяроддзе сучаснай моладзі, і неабходнасць такой прафесійнай яе падрыхтоўкі, якая дазволіць ажыццяўляць адукацыйны працэс ва ўстанове дашкольнай адукацыі з улікам сацыялінгвістычнай сітуацыі ў нашай краіне. Таму мае рацыю весці размову пра фарміраванне прафесійна-маўленчай гатоўнасці педагагічнага работніка дашкольнай адукацыі, якая ўключае шэраг кампетэнцый:

- лінгвістычную — веданне рускай і беларускай моў, здольнасць ажыццяўляць іх

параўнальны аналіз на любым узроўні — фанетычным, лексічным, граматычным;

- камунікатыўную — здольнасць да зносін на рускай і беларускай мовах як у нерэгламентаванай дзейнасці, так і ў спецыяльна арганізаванай;

- народазнаўчую — наяўнасць ведаў аб гістарычным мінулым сваёй краіны і яе сучаснасці, быце, культуры, звычаях і традыцыях народа.

Фарміраванне гэтых кампетэнцый у адукацыйным працэсе факультэта дашкольнай адукацыі адбываецца ў першую чаргу праз адпаведны змест адукацыі, які рэгламентуецца вучэбным планам, створаным у 2013 годзе. З пункту гледжання лінгвакультуралагічнай накіраванасці падрыхтоўкі, вучэбныя дысцыпліны спецыяльнасці «Дашкольная адукацыя» магчыма класіфікаваць наступным чынам:

**Вучэбныя дысцыпліны, якія выкладаюцца на беларускай мове**

| Вучэбныя дысцыпліны | Семестры, у якіх вывучаецца дысцыпліна | Колькасць акадэмічных гадзін | Формы кантролю |
|---|---|---|---|
| Беларуская мова | 1—7-ыя семестры | 396 | 2 залікі, 2 экзамены |
| Дзіцячая літаратура: айчынная дзіцячая літаратура | 5—6-ыя семестры | 224 | Экзамен |
| Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту | 7-ы семестр | 152 | Экзамен |

Па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова» ў 2018 годзе значна перапрацаваны змест вучэбнай праграмы, і сёння ён:

- выпрацоўвае ў студэнтаў уменне эфектыўна карыстацца беларускай вуснай і пісьмовай мовай;

- рыхтуе студэнтаў да фарміравання ў дзяцей дашкольнага ўзросту беларускамоўных арфаэпічных навыкаў, узбагачэння іх слоўнікавага запасу;

- раскрывае спецыфіку выкарыстання лексічных і фразеалагічных адзінак у вусным маўленні дзяцей дашкольнага ўзросту і тыповыя памылкі ў беларускім вусным маўленні.

У выкладанні выкарыстоўваюцца тэксты з выданняў па дашкольнай педагогіцы і дзіцячай псіхалогіі, у тым ліку з мэтай перакладу з рускай мовы на беларускую, аўтарскія творы, якія адлюстроўваюць адметнасці нацыянальнай культуры і духоўнай спадчыны беларускага народа.

Змест вучэбнай дысцыпліны «Дзіцячая літаратура: айчынная дзіцячая літаратура» забяспечвае як непасрэднае авалоданне студэнтамі літаратурнымі творамі — ад фальклору да сучаснасці, так і навыкамі аналізу мастацкага твора, уменнямі вызначаць яго пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял, узбагачае эмацыянальна-каштоўнасны і творчы вопыт студэнтаў.

Пералічаныя вучэбныя дысцыпліны больш арыентаваны на фарміраванне лінгвістычнай, камунікатыўнай і народазнаўчай кампетэнцый.

Вучэбная дысцыпліна «Развіццё беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту» носіць метадычны характар, фарміруе лінгвадыдактычную кампетэнтнасць праз авалоданне сістэматызаванымі ведамі пра развіццё маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму, методыкай развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Па гэтай дысцыпліне вучэбным планам і праграмай прадугледжаны не толькі лекцыйныя і практычныя заняткі, але і правядзенне лабараторных заняткаў на базе ўстаноў дашкольнай адукацыі.

Асабліва неабходна падкрэсліць, што выкладанне дадзенай дысцыпліны на факультэце дашкольнай адукацыі забяспечваецца вядомымі ў краіне і за яе межамі навукоўцамі ў галіне развіцця дзіцячага маўлення — дактарам педагагічных навук, прафесарам Наталляй Сцяпанаўнай Старжынскай, кандыдатам педагагічных навук, дацэнтам, загадчыкам кафедры методык дашкольнай адукацыі Дзінай Мікалаеўнай Дубінінай. Гэтымі аўтарамі створаны вучэбна-метадычны комплекс па дадзенай дысцыпліне, а таксама шэраг вучэбна-метадычных дапаможнікаў для студэнтаў спецыяльнасці «Дашкольная адукацыя».

Другая група вучэбных дысцыплін, якія садзейнічаюць фарміраванню, галоўным чынам, народазнаўчай кампетэнтнасці будучых педагагічных работнікаў, выкладаецца на рускай мове. У іх змест арганічнай часткай уваходзяць тэмы, якія раскрываюць пытанні распрацоўкі тэорыі прадмета ў работах айчынных аўтараў або нацыянальную спецыфіку мастацкіх з'яў.

Сярод іх — «Педагогіка», дзе адпаведныя пытанні традыцыйна разглядаюцца ў раздзеле «Гісторыя адукацыі», а ў раздзеле «Педагагічныя сістэмы і тэхналогіі» — сучасныя айчынныя педагагічныя тэхналогіі дашкольнай адукацыі.

У вучэбнай дысцыпліне «Дашкольная педагогіка» разглядаюцца тэмы, прысвечаныя народнай педагогіцы, выхаванню асноў патрыятызму і грамадзянскасці, тэарэтычным асновам эстэтычнага выхавання, краязнаўчаму падыходу ў азнаямленні дзяцей дашкольнага ўзросту з сацыяльнай рэчаіснасцю.

Пры вывучэнні студэнтамі методык дашкольнай адукацыі (методык развіцця маўлення, фізічнага выхавання, азнаямлення з прыродай, кіраўніцтва выяўленчай дзейнасцю, музычнага выхавання, фарміравання элементарных матэматычных уяўленняў дзяцей дашкольнага ўзросту) разглядаюцца пытанні іх станаўлення і развіцця ў нашай краіне.

Паколькі вывучэнне методыкі кіраўніцтва выяўленчай дзейнасцю і методыкі музычнага выхавання непарыўна звязана з азнаямленнем студэнтаў з мастацкімі з'явамі, у змесце дадзеных вучэбных дысцыплін прадугледжана разгляданне тэм, якія датычацца дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі (нацыянальная вышыўка, ткацтва, беларускі роспіс, дываны, пляценне з саломкі, лазы, ільновалакна, асакі) і беларускага музычнага фальклору (нацыянальныя асаблівасці музычнай мовы, жанраў, інструментаў і інш.).

Трэцяя група вучэбных дысцыплін мае яскрава акрэсленую практычную накіраванасць, пры іх вывучэнні фарміруюцца практычныя ўменні і навыкі студэнтаў. Пры гэтым разнастайныя з'явы нацыянальнай культуры з'яўляюцца ў даным выпадку незаменным матэрыялам. Гэта беларускія народныя гульні («Развіццё гульнявой дзейнасці дзяцей дашкольнага ўзросту»); літаратурныя («Выразнае чытанне»), песенныя і танцавальныя ўзоры («Хор», «Рытміка»); народны тэатр «Батлейка» («Тэатральная дзейнасць ва ўстанове дашкольнай адукацыі»), ткацкія вырабы, вырабы з саломкі і ўзоры беларускага роспісу («Дзіцячае ручное ткацтва», «Практыкум па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве»).

На факультэце створаны адпаведныя беларускія тэрміналагічныя слоўнікі, вядзецца работа па распрацоўцы шырокага кола практычных і даследчых заданняў з мэтай стымулявання студэнтаў як да больш шырокага ўжывання беларускай мовы, так і да выкарыстання нацыянальна спецыфічнага матэрыялу ва ўласных «метадычных скарбонках».

Істотную ролю ў падрыхтоўцы будучых педагагічных работнікаў адыгрывае выкарыстанне метадычных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў для педагагічных работнікаў устаноў дашкольнай адукацыі, вучэбных дапаможнікаў для дзяцей дашкольнага ўзросту падчас правядзення заняткаў, праходжання студэнтамі практыкі. Значная частка гэтых дапаможнікаў створана выкладчыкамі факультэта дашкольнай адукацыі, а гэта азначае, што студэнт мае магчымасць атрымаць метадычныя рэкамендацыі па рабоце з дзецьмі дашкольнага ўзросту «з першых рук», часам атрымліваючы матэрыял, які знаходзіцца ў аўтара ў распрацоўцы.

Значнай часткай падрыхтоўкі будучых педагагічных работнікаў з'яўляецца практыка ва ўстановах дашкольнай адукацыі. Падчас праходжання вытворчай практыкі студэнтамі арганізуецца адпаведная работа з дзецьмі дашкольнага ўзросту — ад спецыяльна арганізаваных заняткаў па развіцці беларускага маўлення, арганізацыі нерэгламентаванай дзейнасці дзяцей да правядзення фальклорных забаў і свят.

З 2016 года ў праграму пераддыпломнай практыкі ўключана заданне па правядзенні ва ўстанове дашкольнай адукацыі фізкультурнага мерапрыемства «Беларусіяда», якое ставіць мэтай прапаганду беларускіх народных гульняў.

Азначаная праблематыка прысутнічае і ў вучэбна-даследчай рабоце студэнтаў і магістрантаў. Магчымасці для паглыбленага вывучэння і распрацоўкі студэнтамі шэрагу пытанняў, якія датычацца навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускаму маўленню (у тым ліку у сітуацыі блізкароднаснага двухмоўя), выхавання патрыятызму праз выкарыстанне разнастайных сродкаў, фарміравання ўяўленняў дзяцей аб прыродзе роднага краю, з'явах беларускай культуры адлюстраваны ў тэматыцы курсавых і дыпломных работ.

Дыпломная работа К. Абабуркі «Беларускі народны касцюм як сродак патрыятычнага выхавання дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту» (навуковы кіраўнік — дацэнт Т.В. Паздзеева) атрымала 2-ю катэгорыю на Рэспубліканскім конкурсе навуковых работ студэнтаў (2017), а яе аўтар працягвае навучанне ў магістратуры па прафілізацыі «Экспертыза якасці дашкольнай адукацыі», дзе даследуе асаблівасці педагагічнага суправаджэння патрыятычнага выхавання дзяцей у Рэспубліцы Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Магістрант Н.В. Пралыгіна (навуковы кіраўнік — дацэнт Т.Я. Цітавец) распрацоўвае тэму «Навукова-метадычныя асновы рэалізацыі этнапедагагічных тэхналогій у сістэме дашкольнай адукацыі». У сакавіку 2018 года яна атрымала дыплом 1-й ступені за лепшую навуковую публікацыю на Міжнароднай студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі «Сучасная педагогіка і псіхалогія: праблемы і перспектывы» сярод студэнтаў і магістрантаў краін СНД (г.Цвер, Расія).

Дадзеная праблематыка выклікае зацікаўленасць і студэнтаў магістратуры спецыяльнасці «Тэорыя і методыка дашкольнай адукацыі»: у

2017 годзе выкананы 2 магістарскія дысертацыі, прысвечаныя фарміраванню каштоўнасных адносін да роднай мовы ў дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту і далучэнню іх да беларускага танцавальнага мастацтва.

Зацікаўленасць пытаннямі далучэння дзяцей дашкольнага ўзросту да нацыянальнай культуры адбілася і на дзейнасці студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі факультэта «Дзіця ў сучасным грамадстве: выхаванне, развіццё, адукацыя» (навуковы кіраўнік – дацэнт В.М. Шабека), што дазволіла ў 2017 годзе атрымаць грант Мінгарвыканкама за правядзенне навукова-даследчай работы «Змест і методыка выкарыстання беларускіх народных гульняў у фізічным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту» (у рамках праекта «Беларусіяда»).

Найбольш адметныя вынікі студэнцкіх даследаванняў звычайна адлюстроўваюцца ў публікацыях, значная частка якіх прыпадае на публікацыі матэрыялаў традыцыйнай Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў і маладых навукоўцаў «Гарманізацыя псіхафізічнага і сацыяльнага развіцця дашкольнікаў», якая штогод праходзіць на факультэце ў рамках Дэкады студэнцкай навукі ў нашым універсітэце. Аналіз праблематыкі апублікаваных матэрыялаў дазваляе весці размову пра пэўную пазітыўную дынаміку публікацый па дадзенай тэматыцы: у 2016 годзе іх налічвалася 3, у 2017 — 6, у 2018 – 9.

Значная ўвага ў падрыхтоўцы будучых педагагічных работнікаў надаецца выхаваўчай рабоце. Сярод станоўчых прыкладаў можна назваць шэраг мерапрыемстваў мінулага навучальнага года: арганізацыя валанцёрскім клубам факультэта дашкольнай адукацыі «Добрае сэрца» фальклорных свят: «Каляды» ў 4-й гарадской дзіцячай клінічнай бальніцы г.Мінска, «Масленіца» ў псіханеўралагічным доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў № 1, «Гуканне вясны» ў Мінскім заапарку; удзел студэнцкага тэатра «Адраджэнне Батлейкі» ў IV Міжнародным Калядным фестывалі батлеечных і лялечных тэатраў «Нябёсы» і IV Адкрытым рэгіянальным фестывалі батлеечных тэатраў «Чароўны свет батлейкі», актыўны ўдзел студэнтаў факультэта ў крэатыўных праектах універсітэта — «Беларусіядзе» і «Гарбузовым фэсце» і інш.

Такім чынам, змест і формы арганізацыі адукацыйнай работы са студэнтамі факультэта дашкольнай адукацыі, кадравы і навукова-метадычны патэнцыял факультэта дазваляюць забяспечыць прафесійна-маўленчую гатоўнасць будучых педагагічных работнікаў да арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстановах дашкольнай адукацыі з улікам сучаснай сацыялінгвістычнай сітуацыі.

Людмила БАГНОВСКАЯ,
*главный специалист управления дошкольного, общего среднего, профессионально-технического и среднего специального образования главного управления по образованию Могилёвского облисполкома*

## О ПРИОРИТЕТНЫХ НАПРАВЛЕНИЯХ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

Система дошкольного образования области в 2018/2019 учебном году включает 481 учреждение, реализующее образовательную программу дошкольного образования: 290 яслей-садов (в т.ч. 1 учреждение дошкольного образования частной формы собственности в г.Могилёве), 29 детских садов, 15 дошкольных центров развития ребёнка, 7 санаторных яслей-садов, 2 специальных детских сада – в Могилёве и Бобруйске, 138 учебно-педагогических комплексов детский сад—школа. Число воспитанников составило 45 857 (2016 год – 43 452, 2017 – 44 322), что в сравнении с предыдущим годом на 1 535 детей больше.

С целью обеспечения доступности дошкольного образования осуществляется строительство учреждений дошкольного образования, развиваются новые формы получения дошкольного образования. В 2017 году увеличилось количество групп кратковременного пребывания воспитанников и составило 580 (на 68 больше), из них 542 — на платной основе. В текущем году «Материнские школы», адаптационные, прогулочные и другие группы кратковременного пребывания детей организованы уже во всех регионах области. Введено в эксплуатацию учреждение дошкольного образования на 240 мест в г.Могилёве, реконструировано здание средней школы № 3 г.Кричева для размещения учреждения дошкольного образования на 135 мест.

Данные мероприятия позволили охватить дошкольным образованием 96,2% детей в воз-